**18.** Суаднясіце сімвалічныя жэсты: *1) сціснутыя вусны; 2) усмешка; 3) рука на сэрцы* – і іх значэнне: *а) радасць; б) шчырасць; в) крыўда.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-а, 3-б. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

**19.** Выберыце з прапанаваных толькі назвы дрэў.

*1) ядловец; 2) чарот; 3) яліна; 4) бук.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**20.** Якія словы з дадзеных напісаны няправільна?

*1) мышь; 2) дзень; 3) ночь; 4) цень.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4



**21.** Вучні падбіралі сінонімы да слова ***малюнак***. Васіліса запісала *карціна*, Фёдар – *ілюстрацыя*, Ангеліна – *эцюд*, Дзяніс – *накід*.

Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў. **В)** Васіліса.
**Г)** Фёдар і Ангеліна. **Д)** Дзяніс.

**22.** Якія з дадзеных назоўнікаў ужываюцца толькі ў адзіночным ліку?

*1) малако; 2) пялёстак; 3) цукар; 4) дождж.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

**23.** *Цвёрдая набойка на падэшве абутку пад пятой* называецца … .



**А)** абцас. **Б)** абцуг. **В)** абмётка. **Г)** абшлаг. **Д)** авал.

**24.** Якога слова не хапае ў вершаваных радках А. Дзеружынскага?

*Жарам палае*
*На ўзлеску касцёр –*
*Жоўты,*
*Жоўта-чырвоны*
*… .*

**А)** кіпарыс. **Б)** верас. **В)** жасцёр. **Г)** ціс. **Д)** клён.


Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»


220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/



ГА «БА «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 30900 экз. г. Мінск. 2020 г.


# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2020»

*Чацвер, 20 лютага 2020 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі, у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў



**1.** Разгадайце народную загадку.

*Улетку шэранькі,*
*узімку беленькі.*
*Доўгія вушы мае,*
*хутка ў лес уцякае.*

**А)** воўк. **Б)** ліса. **В)** заяц.
**Г)** мядзведзь. **Д)** вожык.

**2.** Колькі слоў з [ш] ужыта ў вершаваных радках А. Дзеружынскага?

*Шолах, шорах,*
*Дуб шуміць,*
*Лісце шэпча,*
*Шалясціць.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**3.** Як называецца месяц, калі дзеці ідуць на заняткі ў школу пасля зімовых канікул?

**А)** верасень. **Б)** лістапад. **В)** снежань.
**Г)** студзень. **Д)** сакавік.

**4.** Складзіце адгадку народнай загадкі *белыя гарошкі на зялёнай ножцы* з «рассыпаных» літар.

**А)** о, к, м, а, р, а, н. **Б)** ш, а, ы, д, н, л. **В)** а, н, о, ч, в, з, к, а.
**Г)** р, т, а, с, а. **Д)** е, х, ц, а, з, у, ь, д, м, в.

---

**5.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Дзядыідзядзькінадзядзінцыдзяліліdзялянкі.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

---

**6.** Колькі ў дадзеным сказе ўжыта слоў, якія маюць тры склады?

*Мы не маем права не звяртаць увагі на гучанне слова, бо мова апрача дакладнасці патрабуе яшчэ і мілагучнасці* (М. Лужанін).

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---



**7.** У народзе гавораць, што многія істоты – выдатныя жывыя барометры. Напрыклад, *уюн мітусіцца і часта ўсплывае на паверхню вады – набліжаецца ... .*

**А)** моцная навальніца.
**Б)** добрае надвор’е. **В)** рыбак.
**Г)** паўднёвы вецер. **Д)** пахаладанне.

---

**8.** Дадзены назвы населеных пунктаў Беларусі:

*1) Ржаўка; 2) Полацк; 3) Вежань; 4) Асвея.*

Выберыце словы, у якіх 6 літар і 6 гукаў.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**9.** Колькі назваў дрэў у форме множнага ліку ўжыта ў сказе?

*Маленькая палянка ў гушчары абгароджана старым парканам, і над ёй, над суседнімі дубамі, грабамі, ясенямі, бярозамі ўзняўся вялізны і стройны дуб.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**10.** Вызначце «лішняе» слова ў сказе.

*Хутка бегаюць алені, тыгры, страусы, чарапахі.*

**А)** няма «лішняга» слова. **Б)** алені. **В)** тыгры. **Г)** страусы. **Д)** чарапахі.

---

**11.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя?

*1) сараканожка; 2) птушыны; 3) жураўліны.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**12.** Якога прыметніка не хапае на месцы пропуску ў радках народнай песні?

*Ой, палын мой, палыночак,*
*Палын – ... трава,*
*Гарчэй цябе, палыночак,*
*Ва ўсім полі ды няма.*

**А)** пякучая. **Б)** слёзная. **В)** салёная. **Г)** салодкая. **Д)** горкая.

---

**13.** Заблудзілася літара ***ё***. Дапамажыце ёй знайсці сваё месца ў словах на месцы пропуску:

*1) ц..плы; 2) ц..пло; 3) ц..мны; 4) ж..луд.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**14.** Выберыце з дадзеных сказ, у якім дзеяслоў ужыты ў форме адзіночнага ліку цяперашняга часу.

*1. Вучні пайшлі на экскурсію ў краязнаўчы музей.*
*2. Звініць лес птушынымі галасамі.*
*3. Пасля ўрокаў сяброўкі будуць збірацца на прагулку.*

**А)** няма патрэбнага сказа. **Б)** усе сказы. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**15.** Ігнат запісваў па памяці вершаваныя радкі М. Пазнякова.

*Беларускія балоты,*
*Кажуць, – лёгкія Еўропы,*
*Бо нястомна з году ў год*
*Выдзяляюць ... .*

Якое слова прапусціў хлопчык?



**А)** кісларод. **Б)** аміяк. **В)** вуглякіслы газ. **Г)** торф. **Д)** пар.

---

**16.** Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае ў скорагаворцы слова?

*Ля ракі ў лясным гушчары церамок узвялі* ***тры*** *бабры.*

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** лічэбнікам. **Д)** займеннікам.

---

**17.** Сябры прачыталі вершаваныя радкі Х. Гурыновіча:

*Давайце, юныя сябры,*
*Па дрэўцу восенню пасадзім*
*Ля кожнай лавачкі ў двары*
*І паўз сцяжынкі ў школьным садзе.*

Валодзя сказаў, што спалучэнне *юныя сябры* – гэта параўнанне. Міхалка не згадзіўся і сказаў, што гэта зваротак. Ігар сказаў, што гэта ўдакладненне. Антось не згадзіўся з сябрамі. Хто меў рацыю?

**А)** ніхто з сяброў. **Б)** Валодзя. **В)** Міхалка.
**Г)** Ігар. **Д)** Антось.